Кіно

# «На векі вечныя»

## Аб чым будзе першы беларуска-кітайскі фільм

**Дагавор аб сумеснай вытворчасці фільма 22 жніўня падпісалі Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» і кампанія Sichuan Blue Eyes Film and Television Culture Media (КНР).**

Рабочая назва фільма — «На векі вечныя». Па сюжэце хлопец з Беларусі і дзяўчына з Кітая воляю выпадку адпраўляюцца ў адно і тое ж падарожжа. Там паступова яны разблытваюць забытую гісторыю гібелі беларускага лётчыка ў 1939 годзе ў Кітаі.

Па словах **акцёра і прадзюсара Лэй ХАНЯ**, у фільме будуць пераплятацца гістарычная і сучасная часткі.

— Гістарычная частка ахоплівае той перыяд, калі падчас Другой сусветнай вайны савецкія добраахвотнікі дапамагалі кітайцам змагацца з японскімі агрэсарамі. Асноўная мэта гістарычнай часткі — паказаць, што супрацоўніцтва Беларусі і Кітая склалася ўжо даўно. Сёння мы таксама настроены на мірнае ўзаемадзеянне. Асноўная мэта сучаснай часткі сюжэта — паказаць знешнюю прыгажосць Кітая і Беларусі, а таксама ўнутраную духоўную прыгажосць, — растлумачыў ён.

Прадзюсар падзяліўся інфармацыяй, што 30 % кінастужкі зоймуць гістарычныя дзеянні, 30 % — сучасны час у Беларусі, і яшчэ 40 % — сучаснасць у Кітаі.

У сваю чаргу **Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Юрый АЛЯКСЕЙ** заявіў, што гэта пагадненне ўмацуе сяброўства дзвюх дзяржаў, а сам праект дапаможа больш глыбока пазнаёміцца з кітайскай і беларускай культурамі.

— Магчыма, гэта першы крок да такога маштабнага супрацоўніцтва, але ўжо цвёрды і ўпэўнены. Я думаю, у будучыні мы разгледзім магчымасць стварэння сумесных анімацыі, а нашы маладыя аніматары змогуць атрымаць неацэнны вопыт, — адзначыў ён.



Па словах Юрыя Аляксея, графіку для фільма будуць ствараць у Кітаі.

— У іх больш прасунутыя тэхналогіі, якія нам цікавыя. Я хацеў бы, каб нашы тэхнікі, аператары і мантажоры паехалі ў Кітай і атрымалі досвед работы з сур'ёзнымі тэхналогіямі. Вялікую стаўку мы робім на маладых хлопцаў з Акадэміі мастацтваў, паколькі для іх гэта будзе жывы прыклад, і яны шмат чаму навучацца, — падзяліўся ён.

Да таго ж Юрый Мар'янавіч дадаў, што ў нашых народаў вельмі шмат агульнага.

— Я быў з візітам у Кітаі. Гэта вельмі блізкія нам па духу людзі. Самае галоўнае — яны добрапрыстойныя, сумленныя, і нам вельмі прыемна з імі працаваць. Вы ведаеце, я ганаруся тым, што ў нас атрымалася на нашым фестывалі «Лістапад» у мінулым годзе выйсці на такія сяброўскія адносіны, якія перайшлі ўжо ў стадыю рэалізацыі. Гэта вельмі важна і для краіны, і ў цэлым для нашага народа.

Кастынг для ўдзелу ў міжнародным праекце пройдзе 24—26 жніўня ў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Так, на галоўную мужчынскую ролю будуць падбіраць прафесійнага акцёра ва ўзросце 20—30 гадоў, таксама будуць шукаць і другарадных герояў. Напрыклад, маладую актрысу славянскай знешнасці і хлопчыкаў розных узроставых катэгорый.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

Нясумнае чытанне

# «Жанчыны тут сышліся талакою дапамагчы нашаткаваць капусты»



## Што літаратурныя героі назапашвалі на зіму

**Лета зіму корміць — недарэмна кажуць у народзе. Беларусы — людзі гаспадарлівыя, звыклі рабіць прыпасы. А як жа без іх? Таму ў кнізе Ганны Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня», што вучыла кабет XIX стагоддзя весці гаспадарку, гэтаму прысвечаны цэлы раздзел — «Як захаваць на зіму свежую капусту ў качанах», «Як захоўваць у сотах свежы мёд цэлы год», «Як захаваць зімой зялёны гарох», «Як захаваць агрэст для страў на зіму», «Як захоўваць зімой свежыя слівы-венгеркі»... Нават у наш час, калі ўсё можна не толькі набыць у краме, але і замовіць па інтэрнэце на дом, хочацца самому назапасіць сакавіты плён лета ў халадзільніку ці каморы. А як рабілі прыпасы нашы літаратурныя героі і што менавіта яны назапашвалі — давайце ўспомнім разам.**

### Грыбы

Якуб Колас дужа любіў збіраць грыбы. Цэлыя кошыкі баравікоў дадому прыносіў. Таму ў хаце заўсёды меліся назапашаныя грыбочкі. І ў паэме «Новая зямля» пра гэта гаворыцца:

*«Мне не даюць грыбы спакою,*
*Баравікі мне часта сняцца,*
*Мне з імі трэба паквітацца...*
*Чорнагаловыя, ўдалыя,*
*Баравічкі мае любыя!*
*Якою слаўнаю сям'ёю*
*Вы ўстаяце перада мною!*
*Я помню летнія часіны*
*І вас, грыбныя баравіны!*
*Ранюткі час. Нідзе нікога,*
*Між дрэў звіваецца дарога,*
*А па дарозе ты з кашом*
*У лес шыбуеш ціхачом,*
*Каб ашукаць жанок руплівых,*
*Бяссонных, вечна клапатлівых,*
*І ім на злосць, на зайздрасць тую*
*Набраць грыбоў капу, другую,*
*Пакуль агледзяцца яны,*
*Што там «карэньчыкі адны».*

### Салёныя агуркі

Сярод літаратурных герояў чэмпіёнка па прыпасах, вядома, Вольга Лянովіч, гераіня рамана Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт». Увішная надзвычай гандлярка з Камароўкі... Чаго толькі няма ў яе: ад мукі да пісталета. І ў метадах не сароміцца. Штось вырошчвае сама, а штось і прыўлашчвае. Калі пачалася вайна, пажывілася ў разбітых крамах. А што, вайна — вайною, а жыць трэба! Але каханне да выкупленага палоннага, мройнага ідэалістычнага юнака Алеся, мяняе Вольгу... Паўплывала і сутыкненне з нямецкімі акупантамі, калі тыя заявіліся ў дом дзеля рабунку. Дабраліся нават да пограба, куды пагналі Алеся...

*«Калі зверху асвятлілі ліхтарыкам, здзівіўся прасторы падземелля і колькасці дубовых бочак — іх стаяла штук восем, шматвядзёрных, смачна пахла квашанай капустай, кропам, дубовым лісцем, але пахла і склепам, прэласцю і яшчэ нечым едкім, як аміяк, ад чаго слязіліся вочы.*

*Маўклівы гітлеравец, што спусціўся следам, загадаў яму нахіліць бочку. Ды Алесь не здужаў зрушыць яе з месца. Немец зняважліва паглядзеў, як ён натужваецца, і гэтак жа зняважліва груба адпіхнуў хлопца, так што той бaлюча выцяўся галавой аб бетонную сцяну пограба. Лёгка, адной рукой, немец перакуліў бочку з гуркамі, расол абліў Алесю ногі, гуркі рассыпаліся па бетоннай падлозе, захрусталі пад ботамі ў фашыста, ён давіў іх знарок, з асалодай».*

### Зёлкі

Цёплай парою самы час назапасіць лекавыя зёлкі. У Янкі Купалы ёсць кранальны верш «Бабулька — прадаўшчыца зёлак», на які паэта натхніла падгледжанае ў жыцці:

*«У Менску на рынку,*
*Ў канцы агароды,*
*Бабулька старая*
*Садзіцца заўсёды.*
*Усякія зёлкі*
*На рынак прыносіць*
*І людцаў прахожых*
*Купляць у ёй просіць.*
*Ляжаць перад бабкай,*
*Ці вечар, ці ранак,*
*Пучкі дзівасілу,*
*Чабор і румянак.*
*Ад кожнай хваробы*
*Ё зёлкі, карэнне;*
*Лячыць можа імі*
*Падвей, парушэнне.*
*І любчыку нават*
*Дасць вам пад сакрэтам*
*Ды наўча, як зводзіць*
*Любізнічкам гэтым.*
*І ўсякіх, усякіх*
*Дастанеце лекаў,*
*Якіх толькі людзі*
*Не зналі ад векаў...*
*І кепска бабульцы:*
*Сівая, худая,*
*Брак сіл працаваці,*
*Дык зёлкі збірае.*
*Нясе іх да Менска,*
*На рынку садзіцца,*
*Збывае і вуча,*
*Як трэба лячыцца.*
*А можа, паможа*
*Душы хоць адной дзе,*
*І праца бабулькі*
*На марна не пойдзе».*

Дарэчы, на гэты верш напісаў песню Уладзімір Мулявін.

### Сена

Галоўны герой аповесці Алеся Жука «Паляванне на апошняга жураўля» Сцяпан, ветэран вайны, перажывае, што сучасныя людзі адвучыліся працаваць на зямлі. Напрыклад, назапашваць на зіму сена. Ужо і Сцяпану не трэба гэтага рабіць, але як адвыкнуць?

*«Сцяпан устаў рана. З тою спрадвечнаю трывогаю сенакоснае пары, якую ён памятае з малых год. Трэба скасіць, высушыць, састагаваць сена. Пакуль пагода на дварэ. У памяці гэтая пара жыла пахам дзёгцю, якім тлуста падмазвалі колы, ранняю гаманою на вуліцы — і жанок, і дзяцей...*

*Сцяпан не прыкмячаў сам, што цяпер паўтараў той, дзесяткамі гадоў нажыты лад жыцця. Так ён пачынаў рабочы дзень тады, калі і зямлю аралі коньмі, і з кожнае хаты амаль што было па мужчыну, не кажучы ўжо пра хлапчукоў і хлопцаў, калі касілі і звозілі сена ў гумны, калі жалі і вазілі снапы, і на жніво звінела поле ад песень, калі яму падносілі сноп, калі яму жанкі звівалі вянок!..*

*Цяпер у гумне складаюць сена, канюшыну. Сцяпан не заходзіў у гумно — пастаяў у варотах — вось і ўся яго гатоўка да касьбы: адчыніць гумно, каб скідаць сена, складзі цюкі, калі будзе сцюкаванае. Косамі касіць не трэба, грэбці самім не трэба — чакай, пакуль прывязуць».*

### Квашаная капуста

Уладзімір Караткевіч у вершы «На пачатку дарог» апаэтызаваў працэс нарыхтоўкі капусты. У вёсцы яе назапашвалі талакой, ставілі бочкамі:

*«Жанчыны сечкамі*
*таўкуць бадзёра,*
*Як быццам спора выбіваюць такт*
*Для нейкай небывала*
*хуткай полькі.*
*Ў распараных глотках*
*цёмных бочак*
*Плыве капуста белаю гарой.*
*Яе засыплюць соллю*
*з чорным кмінам*
*І зоркамі*
*чырвонай смачнай морквы,*
*Там-сям антонаўку*
*для духу кінуць*
*І зноўку пачынаюць*
*дружна стукаць...*
*Газніца цьмяна*
*свеціць на шынкоўні:*
*Жанчыны тут сышліся «талакою»*
*Дапамагчы*
*нашаткаваць капусты,*
*А каб сказаць па праўдзе,*
*паспяваць,*
*Пажартаваць,*
*забыўшы ноч і цемру...»*

### Бульба

Для герояў аповесці Васіля Быкава «Знак бяды», старых вяскоўцаў Петрака і Сцепаніды, галоўны запас — гэта бульбачка. Дарэчы, слова «бульба» і вытворныя ад яго паўтараюцца ў гэтай невялікай аповесці дзевяноста чатыры разы!

Пятрок разважае: *«Бульба добра ўрадзіла сёлета, на гародзе яе ўжо выкапалі і засыпалі поўную яму, але і яшчэ будзе не меней. У яму ж каторы год пад вясну находзіць вада, таму рэшту трэба закрыць у капец на пагорку ў канцы гарода — так заўсёды рабілі на хутары ва ўраджайныя на бульбу гады. Бульбачку трэба было шанаваць, тая здаўна была галоўным набыткам з поля — хлеб радзіў не заўсёды і к вясне канчаўся, а бульбачкі часцяком хапала да новай. Калі яе ў час выбраць, засцерагчы ад марозу, вады, дык хапала сабе і скаціне — бульбачка не адзін ужо год бараніла ад голаду».*

Праўда, дарабляць капец з бульбай даводзіцца жонцы Петрака Сцепанідзе: *«Не дужа складаная гэта справа, хоць і лічылася чыста мужчынскай, — забуртаваць якія два вазы бульбы. Сцепаніда падраўняла кучу, падгрэбла, шчыльней абклала саломай і пачала абкопваць зямлёй».*

### Яблыкі

А вось Пімен Панчанка ў вершы «Яблыкі», напісаным у 1975 годзе, падымае важную праблему — як не даць згінуць багатаму ўраджаю садавіны, як палескай антонаўцы трапіць да сталічнага спажыўца?

*«Урадзіла сёлета не скупа*
*Белых, бурштыновых, залатых.*
*І плыве ўначы пад зорны купал*
*Смачны пах садоў, як мёд густы.*

*Як жа гэтым яблыням цудоўным*
*Да сталіцы рукі дацягнуць?*
*Яблыкі галлё у дугі гнуць,*
*Іх — куды ні глянь —*
*усюды поўна.*

*Хрубастаць іх будуць не мінчане,*
*Над ападам горбіцца наш сад.*
*Тут кароў салодкае мычанне,*
*Яблычнае свята ў парасят.*

*Самазвалы*
*на прасёлках грузнуць.*
*Восень.*
*На зямлі і ў небе муць.*
*А па Чорным моры сухагрузы*
*Яблыкі заморскія вязуць.*

*Звар'яцелы вецер свішча рэзка,*
*Недзе ціха тупае зіма.*
*Хочацца антонаўкі палескай...*
*Ёсць, сябры, пытанне ці няма?»*

Што ж, няхай у вашых хатах, шаноўныя чытачы, будзе дастаткова летніх прыпасаў, каб пасмакаваць іх узімку, хай не скончыцца і палеская антонаўка, і бульбачка, і сушаныя баравічкі, і лекавыя зёлкі з беларускіх лугоў!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**